5. *Чжан, Чжимин.* Драма романиста – сравнительная теория пьес Чехова и Лао Шэ / Чжимин Чжан, Шань Чен // Драматическая литература. – 2014. – № 5. – С. 104–106. – Изд. на кит. яз. : 张志明, 陈珊. 小说家的戏剧–契诃夫剧作与老舍剧作比较论. 戏剧文学. 2014. (第五期).

УДК [801.6+82-192](476)

***В. С. Варапаева,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# ПАЭЗІЯ, МУЗЫКА І ВЫКАНАЛЬНІЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА (ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ) ЯК КРЫНІЦА СТВАРЭННЯ АДМЕТНЫХ МАСТАЦКІХ ВОБРАЗАЎ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца праблема інтэрпрэтацыі вершаванага твора з музыкай. Акцэнтуецца ўвага на асаблівасцях лірыкі, пераходу вершаванага твора ў песню; ролі падбору рэпертуара ў выхаванні і развіцці асобы. Даюцца прыклады твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа і іншых беларускіх паэтаў, галоўнымі тэмамі якіх былі матывы Бацькаўшчыны, духоўнай спадчыны, прыгажосці прыроды, увасобленыя настолькі моцна, што, пакладзеныя на музыку, зрабіліся скарбам для нашчадкаў, з аднаго боку, адлюстроўваючы погляд народа, з другога – фарміруючы асобу слухача.

**Ключавыя словы:** мастацтва, верш, змест, мастацкі вобраз, інтэрпрэтацыя, музыка, выканаўца, рэпертуар, мэты, задачы.

***V. Varapaeva,***
*PhD in Pedagogy, Associate professor, Professor of the department*
*of Belarusian and Foreign philology of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# POETRY, MUSIC AND PERFORMANCE (INTERPRETATION) AS A SOURCE OF CREATION OF DISTINCTIVE ART IMAGES

**Abstract.** The article deals with the problem of interpreting a poetic work with the help of music. The emphasis is on the features of the lyrics, the transition of a poetic work into a song; the role of repertoire selection in the upbringing and development of the personality. The article provides examples of the works of Yanka Kupala, Yakub Kolas and other Belarusian poets. The main themes of these people were the motives of the Motherland, spiritual heritage and the beauty of nature, embodied so strongly that, set to

music, they became a treasure for posterity, on the one hand, reflecting the view of the people, on the other, shaping the personality of the listener.

**Keywords:** art, poem, content, artistic image, interpretation, music, performer, repertoire, goals, objectives.

Мастацтва было і застаецца адным з найважнейшых сродкаў у выхаванні, станаўленні і развіцці асобы. Гэта сцвярджэнне тычыцца, безумоўна, сапраўднага мастацтва, якое ў аднолькавай ступені ўплывае на пачуцці і свядомасць чалавека. На вялікі жаль, усё тое выключнае, што напрацавана папярэднікамі, часам не даходзіць да сучаснага пакалення, а яшчэ горш – не цікавіць маладых людзей. Моладзі часта даспадобы тыя песні, сэнс і вобразы якіх аднастайныя і не характарызуюцца глыбінёй.

Думаецца, творчым калектывам, выканаўцам варта ведаць, што аўтарская свядомасць у тэкстах выступае адкрыта, хаця формы яе праяўлення могуць быць разнастайнымі. Спецыфічнай асаблівасцю песні з’яўляецца тое, што чалавек прысутнічае ў ёй не толькі як аўтар, не толькі як аб’ект адлюстравання, але і як яго суб’ект, што ўключаецца ў эстэтычную структуру твораў. Вынікам гэтага аказваецца сканцэнтраванасць лірыкі на ўнутраным стане, перажываннях чалавека. Яе характарызуюць падкрэслена эмацыянальныя адносіны аўтара да выказанага, сцісласць паэтычнай думкі і глыбіня пачуццяў. Словы, ужытыя ў вершы, моцна зацэментаваны падтэкстам, які значна шырэйшы і глыбейшы за непасрэдны прамы сэнс. Мастацкі змест лірычнага твора стварае і гучанне слоў, іх месца ў радку, і рытмічнае чаргаванне складоў. Адзінства эмоцыі і сэнсу слова ў лірыцы – умова яе эстэтычнага ўздзеяння на асобу. Лірыка валодае ўнікальнай якасцю – у параўнанні з эпасам і драмай яна здольна актывізаваць эмацыянальна-маральныя магчымасці чалавека: мастацкае слова як рэальны раздражняльнік можа выклікаць у чалавека той самы духоўны стан, што і рэальныя падзеі. Увогуле песенная творчасць – працэс складаны і накіраваны на стварэнне адпаведных мастацкіх вобразаў, якія можна лічыць вынікам творчага мыслення і формай выражэння ўяўленняў і светапогляду мастака. Няма мастацкага вобраза – няма самога твора, а значыць, няма зместу. Як сведчаць вучоныя М. В. Абабурка, У. П. Масквін. А. М. Пісарэнка, М. М. Шанскі і інш. [1–3], мастацкі вобраз мае шэраг асаблівасцей:

– сукупнасць аб’ектыўнага і суб’ектыўнага, паколькі вобразы ствараюцца мастаком у творчым працэсе, таму яны – вынік асэнсавання рэчаіснасці;

– асацыятыўнасць (створаны аўтарам, але ўбачыць і пачуць яго можа глядач, слухач). Мастак не можа стварыць вобраз без асацыятыўнага мыслення: ён павінен мець здольнасць да арыгінальных асацыяцый, каб звычайны прадмет рэчаіснасці трансфармаваўся ў яго ўяўленні ў мастацкі, значыць, эстэтычна вартасны вобраз.

Вобраз, як правіла, шматзначны (мае розныя тлумачэнні), недасказаны (пакідае прастору для думкі), шматпланавы, уяўляе сабой сплаў эмацыянальнага і лагічнага. Тое самае пачынаецца ў лірыцы (песеннай таксама), паколькі яе аснова – лірычны мастацкі вобраз. І калі ён створаны сапраўдным паэтам, то змест нават лаканічнага лірычнага твора аказваецца шэдэўрам (напрыклад, верлібры М. Танка, зномы А. Разанава, ахвярынкі Р. Барадуліна і інш.)

Песенная ж творчасць – працэс надзвычай складаны і таксама накіраваны на пабудову адпаведных мастацкіх вобразаў. Складнікамі гэтага працэсу з’яўляюцца аўтар – кампазітар – спявак. Усе яны ўплываюць на інтэрпрэтацыю тэксту, які служыць асновай твора, але ў гэтай трыядзе аўтар тэксту застаецца першасным, паколькі стварэнне любога тэкставага вобраза пачынаецца з аналізу зместу твора. Возьмем, адпаведна, «Спадчыну» Янкі Купалы і «Мой родны кут» Якуба Коласа. Для Янкі Купалы спадчына – гэта не проста родны край, якім ён любуецца, якім ганарыцца, гэта найперш перажыванні за яго.

Матывы Бацькаўшчыны, спадчыны, духоўнай і матэрыяльнай – усёй роднай стараны для новых пакаленняў – адны з самых галоўных, вызначаных у творах Янкі Купалы. Жаданне асэнсаваць той найбагацейшы прадметны і маральны набытак, які застаўся нам, нашаму народу «спакон вякоў», яшчэ «ад прадзедаў», гучыць у вершы, а потым і ў песні «Спадчына». Бацькаўшчына для паэта – не абстрактнае паняцце, гэта і *лесу шэпат верасны*, і *вясеннія пратaліны, і ў полі дуб апалены.* Аб самым блізкім, родным і дарагім – аб Радзіме – нагадваюць паэту *стары амшалы тын, што лёг ля вёсак покатам, і тое нуднае ягнят бляянне-зоў на пасьбішчы,* і клёкат бусла на ліпе і г. д.

Бацькаўшчына жыве штодня ў сэрцы лірычнага героя, ён не можа наглядзецца на яе, налюбавацца ёю. Паэт гаворыць «мая»

спадчына, падкрэсліваючы тым самым, што ў кожнага чалавека месціцца ў душы сваё ўяўленне аб *родным* краі, *родным* гняздоў'і, *роднай* зямлі, што ён не прэтэндуе на адзінае і ўніфікаванае акрэсленне яе прыкмет. Патрыятызм пачынаецца з любові да Радзімы, з самага зразумелага, даступнага, калі ўспамінаюцца родныя куточкі, любімыя і дарагія з дзяцінства мясціны. Магутную сутнасць зместу твораў Янкі Купалы (каля 200 з іх сталі песнямі) адчувалі і кампазітары. Невыпадкова на словы паэта напісалі музыку А. Багатыроў, Я. Цікоцкі, А. Молчан, Ю. Семяняка, У. Мулявін, І. Лучанок, а выканаўцамі былі Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла пад кіраўніцтвам Р. Шырмы, вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры», спевакі У. Мулявін, П. Ялфімаў, А. Камоцкі і інш.

У сваю чаргу «Мой родны кут…» Якуба Коласа з'яўляецца ўрыўкам з паэмы «Новая зямля»; твор і па змесце, і інтанацыйна істотна адрозніваецца ад «Спадчыны» Янкі Купалы. Спакойны, лірычны ўрывак, але зместам таксама заглыблены ў родныя краявіды, у ім няма надрыву, трывогі, а бясконцыя карціны таксама ўплываюць на душэўны стан слухача. І гэта выключна перадаецца ў музыцы І. Лучанка і ў выкананні спевака Л. Барткевіча.

Спалучэнне тэксту, музыкі і выканальніцкага майстэрства стварае песенны шэдэўр, высокамастацкі твор. Ці заўсёды гэта ўлічваюць сучасныя кіраўнікі творчых калектываў? Рытарычнае пытанне, амаль як у А. Разанава: «Стаю – і сам пытанне, іду – і сам адказ». Калі ж звярнуць увагу на песенную спадчыну беларускіх паэтаў, то яна надзвычай багатая і разнастайная. І, дарэчы, да гэтага часу недастаткова запатрабаваная. Прычым ёсць творы, якія звязаны з класічнай традыцыяй, калі слова і форма знаходзяцца ў гармоніі, суладдзі, напоўнены дасканаласцю выяўлення, яснасцю і прастатой настрою, дыхаюць свежасцю, вызначаюцца выразнасцю пазіцыі, глыбінёй думкі (іх аўтары П. Броўка, Г. Бураўкін, А. Куляшоў, Н. Гілевіч і інш.). Іншыя ж творы, наадварот, характарызуюцца песенна-народнай стылёвасцю. У іх жыве народны дух, выкарыстоўваецца багаты арсенал прыёмаў, сродкаў вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа. Асабліва яскрава гэта адчуваецца ў паэзіі Р. Барадуліна: менавіта яго творчасць адметная перш за ўсё народным светаадчуваннем, арганічным спалучэннем міфалагічнай і фальклорнай паэтыкі, ёмістай разняволенай моватвор-

часцю, эмацыянальна-стылявой разнастайнасцю. Трыяда «Маці – Мова – Беларусь» – рухаючы імпульс паэта. Вернасць захавання спадчыны мацярынскай і народнай (праз фальклорныя інтанацыі песні, плачу, галашэння, прыпеўкі, замовы, легенды і г. д.) перадаецца праз каламбурную гуллівасць, музычны рытм, афарыстычнасць.

Паказальным таксама з'яўляецца зборнік паэта «Матчыны песні», у якім прасочваецца шматмернае індывідуальна-аўтарскае бачанне выяўленчай пластыкі народных песенных прыёмаў. Ужываючы фальклорна-песенныя матывы, Барадулін не стылізуе, а ўводзіць фальклорны вопыт народнай песні на ўзровень мастацкай індывідуальнасці. Альбомы «Песні матчыны з Ушаччыны», «Маленне за Беларусь» дэманструюць адпаведны аўтарскі талент.

І. Лучанок, Э. Ханок, Э. Зарэцкі, Я. Глебаў, В. Раінчык і іншыя кампазітары напісалі некалькі дзясяткаў песенных шлягераў на вершы Г. Бураўкіна («Белыя крылы», «Паваражы», «Франтавыя дарогі», «Конь незацугляны», «Матылі», «Завіруха» і інш.). У выніку мы маем духоўны набытак, які можа і павінен выкарыстоўвацца новым пакаленнем спевакоў. У арсенале беларускай паэзіі выключныя творы У. Караткевіча, Л. Дранько-Майсюка, Я. Янішчыц, У. Карызны, Р. Баравіковай і многіх беларускіх аўтараў, гэта той скарб, які, безумоўна, павінен актыўна ўжывацца. Праз песню, яе вобразы, з аднаго боку, адлюстроўваецца светапогляд народа, мастацкае бачанне свету аўтараў слоў і музыкі (разам яны ствараюць слоўна-музычны твор), а з другога – такі твор фарміруе асобу слухача, асобу носьбіта мовы, яго маўленчыя здольнасці і духоўныя складнікі характару – дабрыню, патрыятызм, любоў да людзей – сваякоў, землякоў і іншых. Таму на аўтарах і выканальніках – вялікая адказнасць як за слова і вобраз, так і за думкі і пачуцці сучаснікаў, нашчадкаў.

*1.* Мова сучаснай беларускай мастацкай літаратуры / М. В. Абабурка [і інш.]. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2005. – 246 с.

*2. Москвин, В. П.* Художественный стиль как система / В. П. Москвин // Филол. науки. – 2006. – № 2. – С. 65–73.

*3. Пісарэнка, А. М.* Стылістыка беларускага мастацкага маўлення / А. М. Пісарэнка / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 263 с.